## ГІМН БарДУ

Аб’яднае вечнасць кожнае імгненне,
Што нясе жаданне і дае натхненне.
А яшчэ ёсць мэта, што на ўсіх адзіная:
З універсітэта крочыць да Радзімы.

БарДУ – тут студэнтаў братэрства,
БарДУ – гэта наша краіна,
БарДУ – педагогаў майстэрства,
Тут жывём мы сям’ёю адзінай.
БарДУ – ты прамень той яскравы,
Што праходзіць скрозь сэрца і душы.
БарДУ – гэта гонар і слава,
Наш з табою саюз непарушны!

Кім ты станеш, можа толькі час дазнацца:
Мудрым педагогам, добрым правазнаўцам,
Альбо інжынерам з новаю ідэяй…
Трэба толькі вера, шчасце і надзея!

БарДУ – тут студэнтаў братэрства,
БарДУ – гэта наша краіна.
БарДУ – педагогаў майстэрства.
Тут жывем мы сям’ею адзінай.
БарДУ – ты прамень той яскравы,
Што праходзіць скрозь сэрца і душы.
БарДУ – гэта гонар і слава,
Наш з табою саюз непарушны!

Шчырая падзяка тым, хто ў нас паверыў,
Маладосць і якасць адчыняюць дзверы,
Бо ў нас ёсць мэта, што на ўсіх адзіная:
З універсітэта крочыць да Радзімы.

БарДУ – тут студэнтаў братэрства,
БарДУ – гэта наша краіна.
БарДУ – педагогаў майстэрства.
Тут жывем мы сям’ею адзінай.
БарДУ – ты прамень той яскравы,
Што праходзіць скрозь сэрца і душы.
БарДУ – гэта гонар і слава,
Наш з табою саюз непарушны!